11. Паўстанне 1794 г. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://sosnyrest.narod.ru/1794g2.htm. Дата доступу: 13.01.2013.

## АБРАДЫ ВЕСНАВОГА ЦЫКЛУ БЕЛАРУСАЎ ЯК СПОСАБ САЦЫЯЛІЗАЦЫІ ДЗЯЦЕЙ (НА МАТЭРЫЯЛАХ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX СТ.)

Якубінская А. Дз.г. Мінск, БНТУ

Працэс сацыялізацыі ў традыцыйным грамадстве з’яўляецца аптымальным механізмам уключэння дзяцей у сялянскую грамаду і вызначаецца міжпакаленнай трансмісіяй традыцыйнай культуры. Механізм сацыялізацыі ў традыцыйным грамадстве беларусаў другой паловы XIX ст. гарантаваў з’яўленне паўнавартасных членаў сялянскай грамады: здаровых людзей, здольных працаўнікоў, якія ведаюць і ўшаноўваюць духоўную спадчыну сваіх прашчураў, прытрымліваюцца маральных норм і выконваюць законы звычаёвага права. Перадача культурнага вопыту, уздзеянне традыцыі пачыналася ў сялянскім грамадстве беларусаў з моманту нараджэння дзіцяці, што і абумоўлівае цікавасць да вывучэння працэсу сацыялізацыі на першых этапах жыццёвага цыклу чалавека – перыядаў маленства і дзяцінства (ад нараджэння да 12-14 гадоў). Месца і роля дзяцей у гэтых абрадах была дакладна вызначана і абумоўлена іх сацыяльным статусам. Больш таго, сістэма абрадаў была пабудавана такім чынам, што дзіця ўсведамляла ўсю неабходнасць свайго ўдзелу ў тым ці іншым абрадзе, а таксама прававую сілу рытуала, які сімвалічнымі сродкамі вызначаў далейшы лёс яго выканальнікаў і, нават, служыў своеасаблівым каталізатарам духоўных і маральных каштоўнасцяў сялянскага грамадства.

У традыцыйным грамадстве беларусаў існавала перакананне, што ўдзел дзяцей у абрадах веснавога цыклу проста неабходны з-за іх “звышнатуральнай уласцівасці” быццам бы ўплываць на сілы і з’явы прыроды, ураджай, прыплод жывёлы. Вылучаюцца такія веснавыя дзіцяча-юнацкія святы як ”Гуканне вясны”, Свята Тройцы (Сёмуха, “Зялёнае свята”) [1, с. 208–211]. Удзел дзяцей у абрадах веснавога цыклу быў накіраваны на набыццё імі поспеху ў будучай працоўнай дзейнасці, на захаванне здароўя на ўвесь будучы год. На *Грамніцы*, паводле народнага павер’я, зіма з вясной сустракаюцца, каб убачыць гэту сустрэчу і “атрымаць ад зімы ў падарунак чырво-

ныя боцікі" босыя дзеці па снезе беглі на гумно [8, с. 136]. Але, калі яны ў роспачы вярталіся дадому, дарослыя звярталі іх увагу на чырвоныя ад холаду ногі – гэта і ёсць чырвоныя боцікі.

У кліматычна-геаграфічных умовах Беларусі час "гукання вясны" прыпадаў на свята *Благавешчання* (Дабравешчання, Звеставання). Дзіцячыя гурткі хадзілі па вёсцы і спявалі падобную на заклінанне вяснянку, у якой жадалі добрага ўраджаю, скаціне – прыплоду, сям'і – дабрабыту, за што атрымлівалі ласункі – сушаныя чарніцы, яблыкі, гарбузікі, а то нават і яйкі, хлеб, каўбасы. У вяснянках таксама прасочваецца ўяўленне беларускіх сялян аб "магчымасці" дзяцей уплываць на ўрадлівасць і плоднасць:

Благаславі, Божа, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну загукаці.
Дай, Божа, на жытачка род,
На жытачка род,
На статачак плод,
На статачак плод
Людзям на здароўе [9, с. 126].

Сам абрад гукання вясны выконвалі дзяўчаты, якія збіраліся на свабодныя ад снегу ўзвышшы і, седзячы кружком на падасланай саломе, спявалі песні-вяснянкі. Сялянкі Наваградскага павета Мінскай губерні на Благавешчанне пяклі для сваіх дзяцей піражкі ў форме буслоў – "галіопы". Дзеці ў гэты дзень звярталіся да бусла з адмысловым прыгаворам: "Бусля, бусля, на табе галіопу, а мне дай жыта копу!" [5, с. 102]. А маленькія хлопчыкі ў гэты дзень бегалі на суседняе дварышча і збіралі там трэсачкі, каб суседскія куры хадзілі да іх несці яйкі, што з'яўляецца своеасаблівай праявай рэшткаў старажытных магічных дзеянняў,так званая, "сімільная магія".

Вельмі цікавыя абрады выконваліся дзецьмі на *Саракі*. У гэты дзень, паводле народных уяўленняў, з поўдня вяртаецца сорак выраяў. Маці выпякалі сваім дзецям "жаўранкаў" з цеста, а малыя падкідвалі іх дагары з просьбай аб хутчэйшым прылёце птушак [8, с. 147]. На Саракі хлопчыкі павінны былі да ўзыходу сонца прынесці з дварышча 40 трэсачак і высыпаць іх пад печ. Той, хто так зробіць, быццам бы знойдзе сорак птушыных гнёздаў вясной. Таксама ў гэты дзень для моладзі і дзяцей у варотах гумна ладзілі арэлі, на якіх трэба было абавязкова пагойдацца, каб набыць здароўе на ўвесь год [8, с. 142]. Ва Увараўскай воласці Ельнінскага

павета на Саракі дзеці рабілі невялікую труну з рэдзькі, куды змяшчалі тараканаў, прусоў, клапоў. Гэтую труну з лыкавым крыжам яны неслі на пахаванне і, закапаўшы яе, прыгаворвалі: “Жылі не сяляне, памерлі не радзіцелі.”[2, с. 145]. Тут цікава адзначыць, што дарослыя сяляне, вярнуўшыся з пахавання нябожчыка, гаварылі: “Няхай мруць клапы і тараканы, а нам добрага здароўя!” [3, с. 315]. Так пэўным чынам трансфармавалася і праявілася ў каляндарнай абраднасці асэнсаванне дзецьмі пахавальных традыцый беларускіх сялян.

Вялікадню папярэднічала свята *Вербная нядзеля*, “якая захавала з язычніцкіх часоў вераванні аб перадачы здароўя, сілы адроджанай прыроды чалавеку праз непасрэдны кантакт (кантактная магія)” [4, с. 48]. Так, у вёсцы Шаркаўшчызна Дзісненскага павета Віленскай губерні маці на Вербную нядзелю забараняла сваім дзецям есці да канца абедні (асвяшчэння вярбы), каб дзеці нашча з’елі тры пупышкі свянцонай вярбы, што быццам бы абароніць іх ад веснавой ліхаманкі [5, с. 104]. Агульнавядомы звычай хвастаць усіх сустрэчных асвячонымі ў царкве галінкамі вярбы, што быццам бы забяспечвае здароўе на ўвесь будучы год, прыгаворваючы пры гэтым: “Будзь здароў, як вада, а расці, як вярба!” [5, с. 89–90].

У некаторых мясцовасцях Беларусі ў апошні дзень велікоднага тыдня сяляне адведвалі на могілках памерлых родзічаў і сваякоў. На Віцебшчыне ў чацвер велікоднага тыдня сяляне паміналі сваіх памерлых дзетак, для чаго варылі яйкі па іх колькасці і, пакачаўшы яйкі па траве на дзіцячых могілках, з’ядалі [7, с. 244].

Святам пастухоў у беларускіх сялян было *Юр’я*, калі ўпершыню выганялі жывёлу ў поле. У гэты дзень гаспадары частавалі пастухоў хлебам, салам, кілбасамі, давалі сырыя яйкі, з якіх пастухі пяклі сабе яешню, выгнаўшы статак на поле, і святкавалі Юр’я [5, с. 117]. У традыцыйным грамадстве беларусаў існавала “школа пастухоўства” – культурны феномен, накіраваны на фарміраванне ў хлопчыкаў мужчынскай адаптацыйнай стратэгіі: мужчынскай свядомасці і адпаведных паводзін, актыўнай сацыяльнай ролі [10, с. 92]. У хлопчыкаў з 7 год пачынаўся “пастухоўскі век” [9, с. 10]. Некаторыя хлопчыкі, а часам і дзяўчынкі з бедных сем’яў вымушаны былі наймацца ў пастухі ці

падпаскі да больш заможных сялян. Гэты занятак лічыўся цяжкім і непрэстыжным, да таго ж праца падпаска вельмі танна каштавала.

Сляды старажытнага культу расліннасці прасочваюцца ў свяце *Сёмухі* (Тройца, Зялёнае свята), бо хату і падворак сяляне ўпрыгожвалі "маем" – галінакамі бярозы, клёну, ліпы [4, с. 56]. На Сёмуху дзяўчаты ў лесе "завівалі бярозкі" (пераплятալі бярозавыя галінкі), частаваліся яешняй і спявалі траецкія песні, у якіх прасочваецца аналогія з жаночым лёсам. Пасля спеваў дзяўчаты махалі фартухамі і папарна праходзілі пад звязанымі за верхавіны бярозкамі, здзяйсняючы такім чынам абрад "кумлення" [9, с. 190]. Цікава адзначыць, што і ў частаванні пастухоў на Юр'я, і ў частаванні дзяўчат на Сёмуху прысутнічае яешня, таму, магчыма, тут можна весці размову аб агульнай абрадавай страве гэтых веснавых святаў. Таксама ёсць сведчанні, што на свята Сёмухі бацькі не выпускалі дзяцей з дому гуляць у лес, бо там бегае "тучніца" (ваўчыная зграя), ці ў поле, засцерагаючы іх ад русалак [5, с. 120].

Далучэнне да традыцыі ўшанавання продкаў пачыналася з маленства з удзелам дзяцей у абрадах *Радаўніцы* і *Дзядоў* [1, с. 210]. Рытуальная вячэра на Дзяды прадугледжвала саджанне за стол усіх членаў роду адпаведна прынцыпу старшынства, у тым ліку, і дзяцей. Даследчык, які працаваў пад крыптанімам Л.С., пры апісанні памінальных трапез на Дзяды звяртае ўвагу на тое, як бацькі знаёмяць дзяцей з асаблівасцямі прыняцця ежы падчас памінальнай вячэры: пасля кожнага глытка трэба класці лыжку на стол, "каб памерлы продак таксама змог зачарпнуць ежы і не застацца галодным" [6]. У вёсцы Маркава Вілейскага павета Віленскай губерні напрыканцы абрадавай вячэры на Дзяды існаваў звычай даваць гасцям па адной шклянцы парнога малака ў памяць аб памерлых немаўлятах [5, с. 122]. Гэта, сведчыць аб тым, што ў традыцыйным грамадстве беларусаў існавала асэнсаванне каштоўнасці і значнасці кожнага чалавечага жыцця. Такім чынам, працэс трансляцыі дзецям традыцыйных культурных каштоўнасцей, іх далучэнне да традыцыі ўшанавання продкаў садзейнічаў самавызначэнню дзіцяці, якое пачынала атаясамліваць сябе з пэўным родам, прадстаўнікі якога займалі ўласную нішу ў грамадстве.

Удзел дзяцей у каляндарных абрадах веснавога цыклу пачынаўся з пяці – шасцігадовага ўзросту, калі дзіця пачынала ўключацца ў працоўную дзейнасць сялян праз фарміраванне ўласных працоўных абавязкаў у бацькоўскай гаспадарцы. Таму месца дзіцяці ў абрадавых дзеяннях сям'і вызначалася яго гаспадарчай роляй. Амаль усе абрады, выканальнікамі якіх былі дзеці і моладзь, звязаны са святкаваннем "пачатку" (святы "Васілля", "Гуканне вясны", "Сёмуха"). Гэта тлумачыцца сацыяльнай роляй дзіцяці ў традыцыйным грамадстве беларусаў другой паловы XIX ст., якая сімвалізуе пачатак, зараджэнне чагосьці новага, унікальнага, своеасаблівага і адметнага. Сацыяльнае значэнне ўдзелу дзіцяці ў такіх святах вызначалася верай беларусаў у "звышнатуральную" ўласцівасць дзяцей "уплываць" на ўрадлівасць і плоднасць, на сілы і з'явы прыроды. Такім чынам, праз удзел у каляндарных абрадах дзеці пачыналі асэнсоўваць сваю сацыяльную ролю і далучаліся да этнічнай культуры.

Выкарыстаная літаратура

1. Беларусы : у 8 т. – Мінск : Беларус. навука, 1995 – 2008. / Т. 5. : Сям'я / В.К. Бандарчык [і інш.]; рэдкал.: В.К. Бандарчык. – 2001. – 375 с.

2. Добровольский, В.Н. Смоленский областной словарь / В.Н. Добровольский. – Смоленск: Тип. П.А. Силина, 1914. – 1022 с.

3. Добровольский, В.Н. Смоленский этнографический сборник / В.Н. Добровольский // Записки Императорского Русского Географического Общества по Отделению Этнографии.– 1893. – Т. 23. – Вып. 1. – Ч. 2. – 443 с.

4. Земляробчы каляндар: абрады і звычаі / уклад. А.І. Гурскага. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – 429 с.

5. Крачковский, У.Ф. Быт западно-русского селянина / Ю.Ф. Крачковский; Изд. Имп. о-ва истории и древностей российских при Моск. ун-те. – М.: Университетская тип., 1874. – 212 с.

6. Л.С. Дзяды / Л.С. // Гродненские губернские ведомости. – 1891. – № 97. – Неофициальная часть.

7. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные предания о лицах и

местах / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губернская тип., 1897. – 171 с.

8. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – Вып. 8: Быт белоруса. – Вильно: Б. м., 1912. – 124 с.

9. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-западного края / П.В. Шейн. – Т.1.Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – СПб.: Тип. Императорской Академии наук, 1887. – 585 с.

10. Якубінская, А.Дз. Традыцыйная сацыялізацыя дзяцей беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX стст. / А.Дз. Якубінская. – Мінск: РІВШ, 2010. – 118 с.

## БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ У ПАЧАТКУ XX СТ. І ПРАБЛЕМА БЕЛАРУСКАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

Унучак А.У. г. Мінск, Інстытут гісторыі НАН Беларусі

На пачатку XX ст. галоўныя лідэры беларускага нацыянальнага руху гуртаваліся вакол тыднёвіка “Наша Ніва”, які выходзіў у 1906–1915 гг. У няпростых умовах развіцця нацыятворчых працэсаў на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. сфарміравалася “нашаніўская” ідэалогія, якая стала дамінаваць у нацыянальным руху і зрабілася вызначальнай для беларускай ідэнтычнасці. Разам з гэтым, трэба адзначыць, што адначасова з “нашаніўскай” ідэалогіяй на тэрыторыі Беларусі функцыянавалі і мелі папулярнасць “заходнеруская” і “краёвая” ідэалогіі.

Згодна з аўтарам адзінай на сённяшні дзень сінтэтычнай манаграфіі, прысвечанай “заходнерусізму”, А. Цвікевічам: “пад “заходнерусізмам” мы разумеем тую плынь у гісторыі грамадскай думкі на Беларусі, якая лічыла, што Беларусь не з’яўляецца краінай з асобнай нацыянальнай культурай і не мае дзеля гэтага права на самастойнае культурнае і палітычнае развіццё, але што яна з’яўляецца культурна і дзяржаўна часткай Расіі і таму павінна разглядацца як адзін з яе састаўных элементаў” [1, с. 7].

Працяглае знаходжанне Беларусі ў Расійскай імперыі, русіфікацыя прывялі да таго, што ў самой Беларусі сталі з’яўляецца грамадскія сілы, якія пры падтрымцы ўладаў Расійскай імперыі сцвярджалі “адвечную” рускасць краю і выключна дабратворны